культура ўяўляе сабой сферу канцэнтрацыі калектыўнага вопыту мінулага і нараджэння інавацый, якія забяспечваюць адаптацыю традыцыйных культурных нормаў да зменлівых умоў існавання этнасу ва ўмовах глабалізацыі.

**Заключэнне.** У эпоху, звязаную з супярэчлівымі працэсамі глабалізацыі, якая з нарастаючай сілай уніфікуе культуры розных народаў, не можа не актуалізавацца праблематыка захавання традыцыйнай народнай культуры. А таму дзяржава надае вялікую ўвагу вывучэнню, захаванню і папулярызацыі традыцыйнай культуры, выпрацоўваецца шэраг прапаноў органамі дзяржаўнага кіравання і зацікаўленымі структурамі. Вырашэнне сучасных праблем патрабуе сістэмнай і скаардынаванай працы ўсіх зацікаўленых бакоў, падтрымкі і папулярызацыі на ўсіх ўзроўнях. Традыцыйная культура – аснова духоўнага развіцця грамадства, сховішча інтэлектуальных і духоўных сіл народа, гарант захавання яго маральнага здароўя. Сёння немагчыма не ўлічваць культурны фактар пры рэалізацыі маштабных задач дзяржаўнага будаўніцтва. Высокі культурны ўзровень насельніцтва, апора на маральныя каштоўнасці і традыцыі народа, якія ствараліся стагоддзямі, павінны стаць асновай фарміравання паспяховага культурнага, палітычнага і эканамічнага развіцця краіны.

Традыцыцыйная культура ўтварае сукупнасць поглядаў і каштоўнасцяў, якія існуюць доўгі час, яна элемент устойлівай сувязі паміж мінулым, сучасным і будучым. А таму вельмі важна не дапусціць, каб працэсы глабалізацыі пацягнулі за сабой знікненне традыцыйных сувязяў, што ўяўляе сабой сур'ёзную пагрозу для ўсяго чалавецтва.


1. Демина Л. В. Сохранение традиционной народной культуры в современном обществе. - Теория и практика общественного развития. - 2011, № 2.-С. 121-125
2. Жарина Л.В. Проблема сохранения культур в условиях глобализации.- Труды БГУ (История, философия. - 2014. - №5.- С. 60-62.
3. Закон РБ Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў РБ».- [Электронный ресурс]. - /Режим доступа http://livingheritage.by/ kultury.pdf.- Дата доступа 04.09.2019
4. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 4 марта 2016 года №180 Об утверждении Государственной программы "Культура Беларуси" на 2016-2020 годы. - [Электронный ресурс ].- /Режим доступа: http://base.spinform.ru/show_doc.fwx?rgn=84909.- Дата доступа 03.09.2019
5. Указ Президента Республики Беларусь о проведении Года малой родины. - [Электронный ресурс ]. - /Режим доступа http://president.gov.by/uploads/documents/2018/247uk.pdf.- Дата доступа 05.09.2019


## ДАСЛЕДАВАННЕ ЦЫГАНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА Ў БССР У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД


***Крэнт Дз.А.,***

*аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Тугай У.В., доктар гіст. навук, прафесар*


Нацыянальная палітыка ў БССР, што здзяйснялася на працягу 1920 – першай паловы 1930-х гг., садзейнічала ўключэнню ва ўсе сферы жыцця краіны прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей, якія пражывалі на абшарах Савецкай Беларусі. Апошняе стала штуршком для арганізацыі даследаванняў, прысвечаных нацыянальным меншасцям ў Беларусі. Так, пры Інстытуце беларускай культуры (з 1929 г. Беларуская акадэмія навук) функцыянавалі даследчыя адзінкі па вывучэнню культуры, мовы і гісторыі латышоў, літоўцаў, палякаў і яўрэяў. Разам з тым, выклікае інтарэс асветліць спробы арганізацыі навуковых даследаванняў у адносінах да нацыянальнасцей, якія не былі патрыманы дзейнасцю канкрэтных інстытуцый.

Мэтай дадзенай работы з'яўляецца акрэсліць ініцыятывы па даследаванню цыганскага насельніцтва ў Савецкай Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання сталі працы міжваеннага перыяду прысвечаныя цыганскаму насельніцтву ў Беларусі, а таксама архіўныя дакументы і матэрыялы мемуарнага характару. Пры напісанні работы выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя метады даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Першая спроба асэнсаваць ролю і месца цыганскага насельніцтва ў Беларусі пасля Першай сусветнай вайны была зроблена у падручніку А. Смоліча "Геаграфія Беларусі" (1919). У асобным параграфе, які быў прысвечаны нацыянальным мен-

шасцям на беларускай этнічнай тэрыторыі, аўтар дае наступную кароткую характарыстыку цыганскаму насельніцтву: “асобную і цікавую этнаграфічную групу прадстаўляюць цыганы, выхадцы з Індыі, якія гавораць сваёй моваю і вядуць качавое жыццё” [1, с. 145]. Аўтар звяртае ўвагу на разбурэнні традыцыйнага ўкладу жыцця цыганоў Беларусі. У выданні адзначаецца, што частка цыганскага насельніцтва пераходзіць да аселага ладу жыцця, канцэнтруецца ў гарадах і займаецца рамяством. Сціслы характар прыведзеных звестак варта звязаць з асаблівасцю выдання (падручнік) і малалікасцю цыганскага насельніцтва у Беларусі.

У наступныя гады даследчыкі і навуковыя ўстановы не праяўлялі інтарэсу да арганізацыі даследаванняў па цыганскай тэматыцы. Новыя тэндэнцыі пачалі праяўляцца пад час інстытуалізацыі навуковай сферы дзейнасці ў БССР. Асабліва гэта тычыцца ўстаноў акадэмічнага тыпу і, ў першую чаргу Інбелкульта, пасля яго рэарганізацыі ў 1924 г. Пра апошняе сведчыць дзейнасць Этнаграфічнай секцыі Інбелкульта, якая распачала сваю працу ў 1925 г. У плане секцыі адзначалася, што “маючы ў складзе свайго насельніцтва некалькі аддзельных народаў і шэраг асобных этнаграфічных груп, Беларусь з’яўляецца краем цікавым для вывучэння <…> з боку іх быту і культуры духоўнай і матэрыяльнай” [2, арк. 170]. Непасрэдна ў плане на 1925/1926 даследчы год прапаноўвалася распрацаваць этнаграфію наступных народаў Беларусі – яўрэяў, палякаў, латышоў, літоўцаў, татараў і цыганоў [2, арк. 170]. Аднак, у далейшым дадзеная ініцыятыва не была рэалізавана. Апошняе варта звязаць з двума акалічнасцямі. Па-першае, секцыя этнаграфіі ў тым жа 1925 г. была рэарганізавана да ўзроўню падсекцыі. Гэта садзейнічала звужэнню праблематыкі памянёнай даследчай адзінкі, засяроджванню ў першую чаргу на арганізацыі даследаванняў прысвечаных беларусам. Па-другое, у прамежку паміж 1924–1928 гг. пры Інбекульце аформіўся шэраг нацыянальных падраздзяленняў па даследаванню яўрэяў, палякаў, літоўцаў і латышоў у кампетэнцыю якіх уваходзіла ў тым ліку і этнаграфічнае вывучэнне памянёных нацыянальнасцей. Падобная арганізацыя навуковай дзейнасці садзейнічала нераўнамернаму развіццю даследаванняў, прысвечаных асобным нацыянальным меншасцям ў Беларусі.

Па гэтай прычыне істотным фактарам для вывучэння цыганскага насельніцтва, станавілася прыватная ініцыятыва даследчыкаў. Адной з нешматлікіх спроб навуковага асэнсавання цыганскага насельніцтва на Беларусі, стаў артыкул беларускага археографа і гісторыка Дз. Даўгялы “Цыганы на Беларусі” падрыхтаваны для часопіса “Наш край” (1926) [3]. У памянёнай рабоце даследчык зрабіў спробу сістэматызаваць накоплены раней матэрыял прысвечаны вывучэнню цыганоў у Беларусі. Навуковец звярнуў увагу на пытанні часу з’яўлення цыганскага насельніцтва і яго колькаснага складу. Цікавай адметнасцю працы, з’яўлялася крытыка даследчыкам, шэрагу крыніц статыстычнага характару. Дз. Даўгяла пераканаўча паказаў недасканаласць перапісу 1897 г. у дачыненні да цыганскага насельніцтва, штучнасць прыведзеных лічбаў. Галоўная ўвага ў артыкуле надавалася ўзаемаадносінам цыганскага насельніцтва з ўладнымі структурамі Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Акрамя таго, даследчык зрабіў акцэнт на сацыяльнай арганізацыі цыганоў у Беларусі, адзначыў асаблівасці сістэмы кіравання іх абшчыны. Аўтар заклікаў да больш дасканалага вывучэння цыганскага насельніцтва і, ў першую чаргу, ўзаемасувязі і культурных уплываў з прадстаўнікамі тытульнай нацыянальнасці [3, с. 34].

Яшчэ адной прыватнай ініцыятывай даследаванняў у галіне цыганалогіі з’яўлялася праца беларускага батаніка і мовазнаўцы У. Адамава. Даследчыкам у 1920-ыя гг. рыхтавалася граматыка цыганскай мовы. Аднак, адзначаная праца была перарвана ў сувязі з арыштам навукоўца. Па сведчаннях Я. Кіпеля, падрыхтаваная граматыка не зацікавіла дзяржаўныя выдавецтвы, а яе рукапіс быў канфіскаваны пры арышце навукоўца [4, с. 77].

Варта адзначыць, што была зроблена спроба і інстытуалізацыі навукова-даследчай дзейнасці пры Інбелкульце па цыганскай праблематацы. Пра апошняе сведчыць зварот упаўнаважанага па справах цыган БССР у адрас Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР, падрыхтаваны у красавіку 1927 г. У памянёным дакуменце яго аўтарам была высунута прапанова аб стварэнні часовай адзінкі па вывучэнню цыганскага насельніцтва Беларусі. Упаўнаважаным былі акрэслены тыя асобы, якія маглі быць задзейнічаны ў рабоце патэнцыйнай навуковай адзінцы: У. Адамаў, Захарава-Сідлярэўская, М. Кудзелька (Міхась Чарот). Памянёная адзінка мусіла распрацоўваць у першую чаргу філалагічны кірунак даследаванняў. Спецыялісты мусілі заняцца падрыхтоўкай беларуска-цыганскага слоўніка, а таксама кароткай граматыкі цыганскай мовы [5, арк. 260].

Абгрунтаванне падобнага падыходу да даследчай працы тлумачылася імкненнем пэўных колаў ў кіраўніцтве Савецкай Беларусі уключыць цыганскае насельніцтва праз пераклады літа-

Репозиторий ВГУ

ратуры ў працэс сацыяльнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР. Аднак, сама ініцыятыва па ўтварэнню дадзенай даследчай адзінкі не была рэалізавана. Апошняе варта звязаць з асаблівасцямі камплектацыі нацыянальных навукова-даследчых адзінак. Нацыянальныя падраздзяленні пры Інбелкульце, камплектаваліся з прадстаўнікоў тых народнасцей, якія ўваходзілі ў кампетэнцыю іх вывучэння. Са зместу дакумента вынікае, што цыганская даследчая адзінка мусіла камплектавацца з прадстаўнікоў беларускай нацыянальнасці. Не апошнюю ролю на не спраўджванне ініцыятывы адыграў і той факт, што цыганскае насельніцтва з'яўлялася досыць малалікай меншасцю ў БССР (згодна з перапісам 1926 г., яно складала крыху больш за 2500 чалавек).

Апошняй спробай у міжваенны час звярнуцца да праблемы цыганскага насельніцтва ў Беларусі варта лічыць працу па падрыхтоўцы Беларускай Савецкай энцыклапедыі. Азнаямленне з праектам слоўніка БелСЭ па антрапалогіі, археалогіі, этнаграфіі і міфалогіі дазваляе высветліць, што планавалася падрыхтаваць спецыяльны артыкул, прысвечаны цыганскаму насельніцтву ў БССР [6, с. 24]. Аднак, падрыхтоўка энцыклапедыі была спыненая ў 1937 г.

**Заключэнне.** Такім чынам, вывучэнне ў міжваенны перыяд цыганскага насельніцтва ў Беларусі мела эпізадычны характар. Апошняму садзейнічаў той момант, што ў адрозненні ад іншых нацыянальнасцей, вывучэнне цыганскага насельніцтва не было інстытуалізавана. Акрамя таго, цыганы ў БССР не мела моцнага культурнага асяродку, які мог бы садзейнічаць актывізацыі навуковай працы. Выдадзеныя работы ілюструюць, што найбольшая ўвага даследчыкамі надавалася асвятленню мінулага цыганоў у Беларусі. Заслугоўваюць увагі, спробы прадстаўнікоў савецкага кіраўніцтва і асобных беларускіх даследчыкаў распачаць філалагічны кірунак даследаванняў па цыганскай праблематыцы. У рэалізацыі падобнай ініцыятывы былі зацікаўлены пэўныя колы кіраўніцтва БССР, якія разглядалі арганізацыю падобных даследаванняў, як адзін са сродкаў уключэння цыганскага насельніцтва ў працэс сацыяльнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі.


1. Смоліч, А. А. Геаграфія Беларусі /А. А. Смоліч. – Выд. 4-е – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 405 с.
2. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей ЦНА НАН Беларусі). - Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 6.
3. Даўгяла, Дз. І. Цыганы на Беларусі : гістарычны нарыс / Дз. І. Даўгяла // Наш край. – № 12. – 1926. – С. 25 – 34.
4. Кіпель, Я. Я. Эпізоды / Я. Я. Кіпель. – Нью-Йорк, 1998 – 363 с.
5. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 24.
6. Праект слоўніка БелСЭ : Антрапалогія, Археалогія, Этнаграфія, Міфалогія. – Вып. VIII. – Менск : Выдавецтва БАН, 1935 – 38 с.


## ФРАНКО-НЕМЕЦКИЙ УНИВЕРСИТЕТ КАК ПОПЫТКА СОЗДАНИЯ НАДНАЦИОНАЛЬНОГО УЧЕБНОГО ЗАВЕДЕНИЯ


***Лосева Е.А.,***
*аспирант БГУ, г. Минск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Келлер О.Б., доктор ист. наук, профессор*


Сотрудничество в сфере высшего образования является составной и неотъемлемой частью межгосударственных отношений на современном этапе. Его можно рассматривать не только как средство обеспечения академической мобильности и интеграции в мировое образовательное пространство, но и способ налаживания межкультурного диалога, развития политического, экономического, интеллектуального и духовного потенциала каждой из стран-участниц. Успешный пример такого взаимодействия – Франко-немецкий университет, который отмечает в 2019 г. свой юбилей.

Цель исследования – выявить роль Франко-немецкого университета в развитии сотрудничества Франции и ФРГ в области высшего образования.

**Материал и методы.** Исследование подготовлено на основании текстов франко-немецких соглашений. При написании работы использовались как общенаучные (описание, анализ и синтез), так и специально-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный, историко-системный) методы.

**Результаты и их обсуждение.** Активизация франко-немецких университетских контактов в послевоенное время поставила перед правительствами Франции и ФРГ задачу создания совместных координационных центров и двунациональных высших учебных заведений. И хотя данный вопрос начал подниматься еще в 1960-е гг., реализоваться на практике он смог гораздо

Репозиторий ВГУ